

# Ажывіць казку

**Дзеці дашкольнага ўзросту з вялікім задавальненнем удзельнічаюць у тэатральна-гульнявой дзейнасці. Любімыя казачныя героі з'яўляюцца для іх узорамі для пераймання. У працэсе тэатралізацыі малышы набываюць каштоўныя сацыяльныя навыкі, развіваюць творчыя здольнасці, атрымліваюць урокі дабрыні. Выхаванцы нашай дашкольнай установы — ясляў-сада № 3 Зэльвы — удзельнічаюць і перамагаюць у раённых конкурсах дзіцячых тэатральных калектываў. Іх поспехі — гэта ў многім заслуга выхавальніцы Марыны Пятроўны Шлык.**

Тэатр — адзін з самых дэмакратычных і даступных для дзяцей відаў мастацтва. Ён дазваляе вырашаць многія праблемы педагогікі і псіхалогіі, звязаныя з выхаваннем дзіцяці, развіццём камунікатыўных якасцей, памяці, уяўлення, ініцыятыўнасці. Тэатральна-гульнявая дзейнасць аб'ядноўвае дзяцей, фарміруе паняцце пра пачуццё партнёрства, узаемавыручкі, дапамагае паверыць у сябе.

Перш чым прымераць на сябе вобраз казачнага персанажа, дзеці вучацца слухаць творы мастацкай літаратуры, пералічваць дзеянні галоўнага персанажа, вызначаць яго настрой, ацэньваць учынкі. Падбор літаратурных твораў выхавальніца М.П.Шлык ажыццяўляе на аснове вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. Аддае перавагу казкам з багатым сюжэтам ("Рукавічка", "Коцік, пеўнік і лісіца", "Пшанічны каласок" і іншыя), павучальным казкам ("Казка пра непаслухмяную мышку", "Ліса і казёл", "Як качка лісу вылечыла" і іншыя), вершам ("Пра добрую мышку і мудрую кошку", "Калі нікога няма дома"). Педагог знаёміць дзяцей з рознымі відамі тэатраў, выкарыстоўвае для гэтага лялькі бібабо, шапачкі-маскі для інсцэніроўкі, роставыя тэатральныя лялькі. Марына Пятроўна знаёміць выхаванцаў з прыёмамі лялькаваджэння. Для таго каб ажывіць ляльку, надаць ёй казачны вобраз, а галоўнае, захапіць малыша гульнёй з ёй, выкарыстоўвае пацешкі і вершыкі. У далейшым эцюды з лялькамі ўскладняюцца: яны вядуць паміж сабой дыялогі, вызначаецца паслядоўнасць выступлення герояў, іх з'яўленне на шырме. Дзеці адказныя не толькі за маніпуляванне лялькай (перадаць характэрныя рухі героя), але і за ўменне своечасова сказаць словы, рэплікі. На этапе абыгрывання герояў выхавальнік вучыць не толькі імітаваць іх рухі, але і адчуваць партнёра, дамаўляцца, аб'ядноўвацца ў групы, у адзіны сюжэт, размяркоўваць ролі. Кожнаму свайму выхаванцу Марына Пятроўна час ад часу даручае вядучую ролю.

Пасля заканчэння сярэдняй групы дзеці ўжо валодаюць элементамі мастацка-вобразных, выразных сродкаў (інтанацыяй, мімікай, пантамімай), выкарыстоўваюць іх у індывідуальных і калектыўных эцюдах, інсцэніроўках на зададзеную тэму. Дзеці адрозніваюць віды лялечных тэатраў, засвойваюць правілы паводзін у глядзельнай зале.

Развіваючы творчыя здольнасці дзяцей у старшай групе, Марына Пятроўна вучыць іх асновам акцёрскага майстэрства на матэрыяле практыкаванняў і эцюдаў, праз імправізацыю на аснове добра знаёмых казак. У старшай групе дзеці ўжо ведаюць, што спектакль павінен рыхтаваць творчы калектыў, а тэатр дорыць радасць і творцам, і гледачам. Працуючы над ролямі, дзеці самі шукаюць сродкі выразнасці (позы, жэсты), ствараюць эмацыянальную атмасферу спектакля. Напрыклад, святочнасць, урачыстасць, а таксама гераізм і гордасць пры рабоце над казкай "Золушка", а таксама дабрыню, адчай і ўзаемавыручку пры паказе лялечнага спектакля "Падарожжа ў казку "Церамок". Дзеці заўсёды гуляюць з захапленнем, з азартам, са спачуваннем і суперажываннем персанажам.



**Таццяна ТРАЦЦЯК,**
**намеснік загадчыка**
**ясляў-сада № 3 Зэльвы.**